**А. А. Станкевіч**

# ВОБРАЗ ЖАНЧЫНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ

Аналіз гендарнага дыскурсу ў літаратуры дапамагае рэканструяваць гендарна рэпрэзентатыўныя сацыяльныя, культурныя і філасофскія феномены і гендарную карціну свету. У літаратуры праз вывучэнне жаночых вобразаў і мадэлі ўзаемадзеяння палоў, можна прасачыць спецыфіку рэальных грамадскіх адносін, характэрную для соцыума таго ці іншага часу.

Творчасць Цёткі мае важнае значэнне ў кантэксце гендарных даследаванняў, бо ў ёй прадстаўлены досвед, унутраны свет жанчын і іх сутыкненне

з сацыякультурнымі рэаліямі таго часу. Вобразы жанчые у творах Цёткі шматгранныя і прадстаўлены праз розныя кантэксты, што ствараe аснову для вывучэння фемінінага дыскурсу ў Беларусі пачатку 20 стагоддзя.

Жаночыя вобразы ў творчасці Цёткі характарызуюцца наступнымі рысамі:

- эмацыянальнасць, інтуітыўнасць, гарманічнасць, эстэтызм як яскравыя аспекты жаночага досведу; дасягаецца выключнасць вобразу ў спляценні ўсіх эмацыянальных бакоў жаночай натуры, нават дэструктыўных («Лішняя»);
- выражэнне глыбокага сацыяльнага каментарыя, крытыкі сацыяльных структур і абставін, у прыватнасці, адносіны грамадства да жанчын, праблемы сацыяльнай падтрымкі і ролі, якія жанчыны знаходзяць ці аспрэчваюць у сваім жыцці («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю»);
- маці – знакавая фігура, што «яшчэ ў калысцы пачне навучаць свае дзеткі любіць родны край, родны народ, любіць і паважаць справядлівасць роднага народа» (С. Александровіч). Мацярынская любоў выключная, нязменная, незгасальная, праяўляецца амаль у звышнатуральнай сувязі паміж дзіцем і маці, што часта з'яўляецца паказчыкам і сведчаннем высокага эмацыянальнага інтэлекту жанчыны;
- сімвалізмам і вобразнасцю, што выкарыстоўваецца для перадачы глыбіні жаночага досведу. Напрыклад, вобраз маці («Міхаська»), фальклорны вобраз старой жанчыны-выхавацелькі («Сірата») і г.д.;
- увага надаецца розным сацыяльным групам жанчын – ад сялянак («Вясковым кабетам») да інтэлігентак («Зялёнка»), падкрэсліваючы іх ролю ў грамадстве і асабістае светаўспрыманне. Пісьменніца таксама звяртаецца да школьнай моладзі, да дзяцей («Да дзяўчатак», «Да школьнай моладзі беларускай», «Да вясковай моладзі»), ускладаючы надзею на маладое пакаленне, здольнае забяспечыць росквіт краіны на прынцыпах роўнасці, свядомасці, самапавагі і патрыятызму.